**Л.М.Рагачова,** *дацэнт*

# ФАРМІРАВАННЕ ПРАФЕСІЯНАЛЬНАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ СТУДЭНТАЎ: ПЕДАГАГІЧНЫ АСПЕКТ

Сучасная адукацыйная палітыка базіруецца на новых метадалагічных прынцыпах, якія звязаны з прызнаннем гуманістычнай парадыгмы яе развіцця. Сацыяльна-эканамічная трансфармацыя грамадства арыентавана на постіндустрыяльны соцыум, у якім вызначальную ролю набываюць такія якасныя характарыстыкі чалавека, як высокі ўзровень індывідуальнай свядомасці, інтэлектуальнага развіцця, накіраванасці і міжасобасных сувязей, ступень уключанасці ў сацыяльныя працэсы, высокая адказнасць за прынятыя рашэнні і ўчынкі. Усе гэтыя складаючыя асобаснага станаўлення неабходныя для перабудовы дзейнасці чалавека на аснове недагматычнага, гуманістычнага, накіраванага на раскрыццё сутнасці мыслення, на прызнанне ім абсалютнай прыярытэтнасці і каштоўнасці чалавечага жыцця.

Значнымі магчымасцямі ў рэалізацыі гэтых падыходаў валодае сфера сацыякультурнай дзейнасці, якая сёння атрымала статус прыярытэтнага развіцця як сфера існавання, дзе кожны чалавек самастойна, зыходзячы з патрэбнасцей яго асобаснага свету, выбірае формы і віды дзейнасці, каштоўнасныя арыентацыі, шляхі дасягнення пастаўленых мэт. Яна забяспечвае асобе спрыяльныя ўмовы для яе цэласнага развіцця, што дасягаецца актуалізацыяй інтэлектуальнай, валявой, эмацыянальнай сфер у працэсе ўспрымання ёю вышэйшых каштоўнасцей айчыннай і сусветнай культуры, ідэалаў дабрыні, чалавечнасці, годнасці. Аднак якаснае ажыццяўленне адзначаных параметраў развіцця чалавека звязана з узроўнем прафесійнай падрыхтаванасці работнікаў.

Сучасны падыход да канструявання мадэлі спецыяліста сацыякультурнай дзейнасці адмаўляецца ад жорсткага сацыяльнага нарміравання, калі сістэмаўтваральнай адзінкай прызнаваліся вс-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ды, уменні і навыкі, а асобасная непаўторнасць разглядалася толькі ў якасці фону для ўзнаўлення заданых параметраў дзейнасці. Экскурс у недалёкае мінулае нашай Айчыны сведчыць, што як змястоўныя, так і канструктыўныя аспекты дзейнасці ўстаноў культуры і мастацтва будаваліся на падставе нарматыўных патрабаванняў, дзе не заставалася прасторы для свабоднага пошуку і стварэння новых праяў культурнага жыцця. У выніку сапраўдная творчасць чалавека як выяўленне яго духоўнага свету аказалася абмежаванай, а культурастваральная дзейнасць не знаходзіла падтрымкі ў дзяржаўных установах культуры.

Таму сёння гуманістычная накіраванасць развіцця грамадства надае прыярытэтнасць у падрыхтоўцы кадраў актуалізацыі іх асобасных характарыстык, патрабуе самасвядомай самастойнай работы па пастаянным самавызначэнні і выхаванні сябе як прафесіянала. Сучаснае паняцце прафесіянала звязана з вобразам спецыяліста, які гарманічна сумяшчае ў сабе высокі патэнцыял асобасных якасцей і глыбокія веды і ўменні ў сферы прафесійнай дзейнасці. Значным параметрам гэтага працэсу выступае дыялектычнае адзінства агульнага і прафесіянальнага развіцця спецыяліста, дзе абодва бакі ўзаемазвязаны: агульная культура выступае асновай, базай прафесіянальнага фарміравання, а прафесіянальнае ўдасканаленне дэтэрмінуе патрэбнасці ў агульнакультурным прагрэсе. У выніку ажыццяўляецца цэласны працэс развіцця асобы, які стварае найбольш спрыяльныя ўмовы для захавання і развіцця унікальнага ўнутранага патэнцыялу індывіда. Зразумела, што ў падрыхтоўцы такога спецыяліста значна ўзрастае роля ўнутраных дэтэрмінантаў у забеспячэнні прафесіянальнага станаўлення асобы, у тым ліку і самасвядомасці як аднаго з важнейшых рэгулятараў чалавечай дзейнасці.

Як сведчыць псіхалагічная навука, самасвядомасць – гэта свядомыя адносіны чалавека да сваіх патрэбнасцей, імкненняў і матываў паводзін, перажыванняў і думак. Яны таксама праяўляюцца ў эмацыянальна-сэнсавай ацэнцы сваіх суб'ектыў-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ных магчымасцей, якія выступаюць у якасці аснавання для мэтанакіраваных дзеянняў і ўчынкаў [2, с.332].

Такім чынам, адносіны да самога сябе, сваёй дзейнасці, якія дапаўняюцца і спалучаюцца з ацэнкай, што даюць асобе іншыя ўдзельнікі працэсу сумеснай дзейнасці, ствараюць аснову для фарміравання канкрэтнага ўяўлення асобы аб сабе як чалавеку, здольным да грамадска значных дзеянняў. Гэта ёсць, з аднога боку, рэфлексія, а з другога – усведамленне свайго спосабу жыцця, адносін да навакольнага свету і іншых людзей. Як сістэмнае стварэнне самасвядомасць пачынае вызначаць усе наступныя імкненні чалавека.

Зыходзячы з адзначанага, можна сцвярджаць, што прафесіянальная самасвядомасць – гэта спецыфічная ўласцівасць чалавека, якая выяўляецца ў яе адносінах да сваіх патрэбнасцей, матываў, дзеянняў у сферы прафесійнай дзейнасці. Гэтая сфера з'яўляецца прасторай для рэалізацыі асобаснай дзейнаснай сутнасці чалавека. Ад яе паспяховасці ў значнай ступені залежаць станаўленне суб'ектнасці асобы, яе самарэалізацыя.

Як сведчаць даследаванні вучоных, узнікнуўшы, прафесіянальная самасвядомасць становіцца важным звяном у рэгуляванні бягучай дзейнасці і прафесійнага самаўдасканалення суб'екта [1, с.93]. Ад узроўню развіцця прафесіянальнай самасвядомасці залежаць тэмп, паспяховасць авалодання прафесіяй, гарманічнае ўваходжанне ў прафесійную супольнасць. Гэта своеасаблівы ўнутраны фактар развіцця чалавека, дзейнасць якога значна ўзвышаецца з узростам.

З улікам сказанага важным з'яўляецца пытанне аб мэтанакіраваным фарміраванні пазітыўнай прафесіянальнай самасвядомасці будучых спецыялістаў для сацыякультурнай прасторы. Паспяховасць гэтага працэсу звязана з выразным разуменнем структуры і зместу гэтага феномена і, як вынік, – з усведамленнем шляхоў яго фарміравання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Псіхалагічная навука вылучае наступныя структурныя кампаненты ў прафесіянальнай самасвядомасці асобы :

– кагнітыўны, гэта значыць уяўленне аб сабе як суб'екце прафесійнай дзейнасці, сваіх магчымасцях для яе арганізацыі. Указаная падструктура самасвядомасці ствараецца як вынік працэсаў саманазірання, самаўспрымання. Яна забяспечвае ўмовы для свядомай самаактуалізацыі і самаразвіцця. Такім чынам, кагнітыўная складаючая фарміруе фундамент для прафесіянальнай самасвядомасці і мае вельмі вялікае значэнне для станаўлення спецыяліста;

– афектыўна-ацэначны, які раскрывае адносіны да сябе як да прафесіянала і ацэнку свайго прафесійнага «Я». Эмацыянальная афарбаванасць адносін стварае адпаведны (пазітыўны ці негатыўны) псіхалагічны фон, на аснове якога разгортваецца далейшая мэтанакіраваная работа па стварэнні свайго прафесійнага «Я»;

– рэгулятыўны, які раскрывае імкненне дзейнічаць у адносінах да сябе як да прафесіянала і канкрэтныя дзеянні па дасягненні прафесійнай кампетэнтнасці, адчуванне сябе суб'ектам гэтай дзейнасці.

Аналіз праведзеных даследаванняў са студэнтамі Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры сведчыць, што кагнітыўны кампанент прафесіянальнай самасвядомасці прадстаўлены дастаткова абгрунтавана. Абсалютная большасць студэнтаў уяўляе сваю будучую дзейнасць, яе асноўныя кірункі і формы, бачыць сябе ў якасці суб'екта гэтага працэсу. Аднак сур'ёзнай праблемай выступае ўяўленне сваёй прафесійнай самарэалізацыі, зыходзячы толькі з дыдактычнага патэнцыялу, які быў атрыманы ў ходзе засваення спецыяльных прадметаў. Як адзначалася намі, такі падыход вельмі часта прыводзіць да тэхнакратычнай мадэлі ў фарміраванні спецыяліста, калі блок ведаў не спалучаецца з асобасна-духоўным развіццём студэнта, і ў выніку гуманістычны падыход да ўдзельнікаў сацыякультурнага працэсу губляе сваю сутнасную суб'ектную накіраванасць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Другі кампанент – афектыўна-ацэначны – прадстаўлены ў асноўным абагульненымі характарыстыкамі сучаснага стану прафесійнай дзейнасці, якія сведчаць аб недастатковым вопыце самастойнай работы ў прафесійнай прасторы, а таксама аб несфарміраванасці ўменняў аналізаваць свае індывідуальныя пошукі і праекты ў працэсе прафесіяналізацыі.

Рэгулятыўны кампанент як адлюстраванне асэнсаванага падыходу да вучэбнага працэсу, да пашырэння сваіх ведаў і уменняў па-за рамкамі аўдыторнай дзейнасці, імкнення да самастойнага творчага падыходу ў вырашэнні прафесійных задач – таксама не атрымаў сістэмнага характару і прадстаўлены ў асноўным адзінкавымі эпізодамі.

Адзначаная сітуацыя сведчыць аб неабходнасці актывізацыі вучэбнага працэсу ў кірунку фарміравання прафесіянальнай самасвядомасці студэнтаў праз стварэнне ўмоў для развіцця суб'ектнасці кожнага студэнта. Метадычна мэтазгодна ў гэтым плане будаваць працэс навучання ў сістэме «палілогу», калі кожны ўдзельнік вучэбных заняткаў выступае як суб'ект пазнання і стварэння сваёй сістэмы ведаў, адаптаванай да ўнутранага свету і сацыяльнага вопыту асобы студэнта.

Найбольш эфектыўна сістэма «палілогу» можа быць выкарыстана на семінарскіх занятках, дзе без парушэння вучэбнага працэсу можна ствараць кароткатэрміновыя мікрагрупы па абароне розных падыходаў і пазіцый да арганізацыі сацыякультурнай дзейнасці, падтрымліваць атмасферу сумеснага пошуку, найбольш адпаведнага пастаўленым мэтам.

Вядучымі метадычнымі патрабаваннямі да арганізацыі такога тыпу работы студэнтаў выступаюць абавязковае ўнясенне ў план семінарскіх заняткаў асобасна арыентаваных заданняў, якія патрабуюць не толькі рэпрадуктыўнага ўзнаўлення вучэбнага матэрыялу, але і яго адаптацыі да канкрэтнай сітуацыі ў сацыякультурнай прасторы (месца арганізацыі дзеяння, узрост удзельнікаў, розны ўзровень гатоўнасці да мастацка-творчай дзейнасці і інш.),

уключэнне асабістага жыццёвага вопыту, эмацыянальнай насычанасці прапанаванага варыянту вырашэння праблемы.

Пры такім падыходзе да правядзення вучэбных заняткаў адбываецца перанос акцэнту з ведаў і ўменняў (аб'ектны падыход у навучанні) на каштоўнасныя адносіны (суб'ектны падыход у навучанні) студэнтаў. Ствараемая педагагічная сітуацыя мае на ўвазе, што кожны ўдзельнік самастойна выбірае мэты, ідэалы, на аснове якіх будучы спецыяліст арыентуецца не толькі ў вучэбным працэсе, але і ў жыцці, у канструяванні сваёй прафесійнай дзейнасці, у зносінах з іншымі людзьмі. Эмацыянальна-каштоўнасныя адносіны не могуць быць заданыя, яны з'яўляюцца адлюстраваннем індывідуальнай пазіцыі асобы, яе актыўнага выбару. Яны могуць быць пазітыўныя ці негатыўныя, але заўсёды застаюцца выражэннем суб'ектнасці, прафесіянальнай самасвядомасці студэнта. Таму актыўнае ўключэнне ў вырашэнне заданых педагагічных сітуацый будзе забяспечваць цэласны працэс станаўлення прафесіянальнай самасвядомасці будучага спецыяліста і яго агульнага развіцця.

У пабудове заняткаў па сістэме «палілогу» з пункту гледжання станаўлення прафесійнай самасвядомасці студэнтаў патрабуецца аб'ектыўная неабходнасць актуалізацыі ўсіх яе кампанентаў: кагнітыўнага, які праяўляецца ў выбары самастойнай пазіцыі па вырашэнні абмяркоўваемай пазіцыі; афектыўна-ацэначнага, які прадугледжвае ўсебаковую самаацэнку сваёй дзейнасці, і рэгулятыўнага, калі патрабуецца знайсці шляхі ўдасканалення асобасных якасцей для абгрунтавання і абароны сваёй пазіцыі. Суб'ектныя адносіны да вывучаемых з'яў, сітуацый, а таксама да самога сябе, звязаныя з прадметам, характарам і зместам прафесійнай дзейнасці, забяспечваюць фарміраванне цэласнай пазіцыі будучых спецыялістаў, якая сінтэзуе як асобаснае ўспрыманне з'яў, так і іх аб'ектыўную шматграннасць і такім чынам стварае фундамент прафесійнай самасвядомасці.

Такім чынам, можна адзначыць, што прафесіянальная самасвядомасць выступае адным з найважнейшых рэгулятараў пра-

фесійнай дзейнасці і прафесійнай культуры спецыяліста. Высокая прафесійная падрыхтоўка і авалоданне прафесійным майстэрствам не могуць быць дасягнуты без усведамлення студэнтам свайго «Я» ў прафесійнай дзейнасці. Таму стварэнне адпаведных модуляў у вучэбным працэсе, накіраваных на фарміраванне прафесіянальнай самасвядомасці, будзе пазітыўна ўплываць на якасць падрыхтоўкі спецыялістаў сферы культуры і мастацтва.

---


1. *Психологический* словарь / Под ред. В.В.Давыдова, А.В.Запорожца, Б.Ф.Ломова и др. – М.: Педагогика, 1983. – С.332.

2. *Маркова А.К.* Психология профессионализма. – М.: Педагогика, 1996 . – С.93.



**Н.У.Самерсава,** *дацэнт*


## САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ЯК СРОДАК І ЎМОВА ЭКАЛАГІЧНАЙ АДУКАЦЫІ

Адной з характарыстык сацыякультурнага асяроддзя з'яўляецца яго экалагічны аспект. Рэальная экалагічная небяспека, што ўзнікла ў сувязі з парушэннем чалавекам асноўных законаў суіснавання з прыродай, ставіць перад чалавецтвам прынцыпова новыя задачы, звязаныя з асэнсаваннем праблем аховы і абароны навакольнага асяроддзя. Зберагчы прыроду – значыць захаваць асноўныя ўмовы жыцця чалавека. Таму экалагічны аспект сацыякультурнай дзейнасці мае на сённяшні дзень прыярытэтную значнасць.

Культуролагі, педагогі і псіхолагі ва ўсе часы высока ацэньвалі ролю прыроды ў фарміраванні асобы чалавека, сцвярджалі той факт, што яго духоўнае жыццё непарыўна звязана з прыродай. У класічнай педагогіцы маюць абгрунтаванне ідэі значнасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ